
НАВІНКІ КНІГАВЫДАННЯ



КНІГА ПРА ГІСТОРЫЮ НАВАГРУДСКАГА КРАЮ

Нядаўна ў выдавецтве УП «Рыфтур» пабачыў свет зборнік навуковых артыкулаў «Гісторыя і сучаснасць Навагрудскага краю».

У выданні прадстаўлены матэрыялы, у якіх разглядаюцца актуальныя пытанні вывучэння археалагічнай і гістарычнай спадчыны Навагрудчыны. Зборнік пад рэдакцыяй доктара гістарычных навук, прафесара Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта С. А. Піваварчыка падрыхтаваны па выніках навуковай канферэнцыі, якая адбылася ў старажытным Навагрудку і была прымеркавана да 980-годдзя горада.

У першым раздзеле пад назвай «Археалагічная спадчына і ранняя гісторыя Навагрудка і ваколіц» разглядаюцца пытанні даследавання помнікаў археалогіі на тэрыторыі Навагрудскага раёна ад эпохі палеаліту да Сярэднявечча, аналізуюцца знаходкі, выяўленыя на месцах археалагічных раскопак. Адной з самых цікавых знаходак у Навагрудку з'яўляецца кубак святой княгіні Ядвігі, які датуецца 2-й паловай XII стагоддзя. Ён быў знойдзены на тэрыторыі Малога замка, што дало падставу кандыдату мастацтвазнаўства з НАН Беларусі К. А. Лавыш аднесці яго да скарбаў княжацкага двара. Кубкі Ядвігі лічыліся ў Еўропе рэліквіямі, выкарыстоўваліся пры каранацыі і набажэнствах, вядома ўсяго 25 такіх знаходак, адна з іх – з Навагрудка.

У другім раздзеле зборніка ў цэнтр увагі даследчыкаў трапілі пытанні гістарычнай спадчыны Навагрудка і ваколіц. Вучоны Інстытута гісторыі НАН Беларусі А. Б. Доўнар засяродзіў увагу на працы магістрата і асобах бурмістраў горада Навагрудка ў 2-й палове XVII стагоддзя. Беларускаму нацыянальнаму руху ў Навагрудку ў міжваенны перыяд прысвяціў свой артыкул кандыдат гістарычных навук Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта А. С. Горны. Іншыя даследчыкі расказалі пра гісторыю Навагрудскай Беларускай гімназіі, развіццё турызму, дзейнасці «Цэнтраў здароўя» і

сельскагаспадарчае развіццё ў Навагрудскім ваяводстве. Аўтар гэтых радкоў прысвяціла артыкул мастацкаму свету выпускніка Навагрудскай гімназіі Валянціна Рамановіча. Доктар гістарычных навук з Гродна Э. С. Ярмусік прасачыў этнаканфесійную сітуацыю на Навагрудчыне, пачынаючы ад старажытных часоў. Навагрудскі краязнавец М. П. Гайба расказаў пра гісторыю вузкакалейнай чыгункі Наваельня - Любча. Цікавыя тэмы закранулі і іншыя даследчыкі. Зборнік прызначаны гісторыкам, супрацоўнікам музеяў, выкладчыкам, студэнтам, а таксама ўсім, хто цікавіцца гісторыяй свайго краю.

Святлана КОШУР
член Саюза пісьменнікаў Беларусі,
краязнаўца, адна з аўтараў выдання

www.pisateli.by